# У брацкай сям'і совецкіх народаў

**С. О. ПРЫТЫЦКІ,**
**сакратар Маладзечанскага абкома КП Беларусі**

Цяжкім і гаротным было жыццё працоўных у заходніх раёнах Беларусі пад прыгнётам польскіх капіталістаў і памешчыкаў. Галеча і голад, цемра і бескультур'е, соцыяльнае і нацыянальнае прыгнечанне, прыніжэнне чалавечай годнасці, — такая была іх доля.

З першых дзён адраджэння польскай дзяржавы пасля першай сусветнай вайны памешчыкі і капіталісты падзялілі яе на дзве часткі — Польшчу «а» (цэнтральная Польшча) і Польшчу «б» або так званыя «Крэсы ўсходні» (усходнія ўскраіны). Сюды ўваходзілі Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна. Калі ў Польшчы «а» развівалася прамысловасць і інтэнсіўна вялася сельская гаспадарка, то «Крэсы ўсходні» польскі ўрад разглядаў як сваю ўнутраную калонію, дзе можна было эксплуатаваць прыродныя багацці, збываць прамысловыя тавары, якія выраблялiся ў цэнтральнай Польшчы, і чэрпаць танную, амаль бясплатную рабочую сілу.

За час панавання польскіх акупантаў прамысловая вытворчасць у Заходняй Беларусі скарацілася на 40 працэнтаў у параўнанні з 1913 годам. Заработная плата рабочага тут была напалавіну меншая, чым у цэнтральнай Польшчы, і складала 80 грошаў — 1 злоты за 12—14-гадзінны рабочы дзень. Жаночая і дзіцячая праца аплачвалася яшчэ горш. Але і гэты заробак быў «вялікім шчасцем» для рабочых, бо, паводле афіцыяльных даных польскай статыстыкі, да 1939 года ў Польшчы налічвалася паўтара мільёна беспрацоўных, зарэгістраваных у гарадах. Разам з поўбеспрацоўнымі, якія былі заняты два—тры дні на тыдні, і беспрацоўнымі ў вёсцы іх было да трох мільёнаў чалавек.

Асаблівую галечу цярпела сялянства заходніх абласцей Беларусі, якое задыхалася ад зямельнага голаду. 16 тысяч польскіх памешчыкаў, якія складалі ўсяго 0,9 працэнта насельніцтва, валодалі большай палавінай зямельных угоддзяў. Зямля належала магнатам — Радзівілам, Сапегам, Чартарыскім, Любамірскім, Патоцкім і ім падобным. Захапілі лепшыя землі і асаднікі, кулакі, якіх узмоцнена насаджалі польскія акупанты ў Заходняй Беларусі. Беларускаму селяніну заставаліся невялікія кавалачкі на пясках і балотах.

Нізкія цэны на сельскагаспадарчыя прадукты і дарагоўля прамысловых тавараў, цяжкія падаткі (іх былі дзесяткі), штрафы і працоўныя павіннасці даводзілі селяніна да крайняй галечы. Гэтага не скрывалі нават афіцыяльныя кругі і прэса.

Старэйшае пакаленне заходніх раёнаў Беларусі памятае, як апрацоўвалі памешчыцкую зямлю за трэці сноп, як варылі ежу без солі, запалку дзялілі на чатыры часткі, асьмушку махоркі куплялі на чатырох чалавек, па вечарах сядзелі з лучынай, хадзілі ў саматканай сярмязе, насілі абутак на драўлянай падэшве.

Соцыяльны прыгнёт узмацняўся нацыянальным. Польскі фашысцкі ўрад і яго нахлебнікі імкнуліся выбіць з свядомасці беларускага народа само разуменне — беларус, імкнуліся ператварыць яго ў маўклівага раба. Была забаронена беларуская мова, ліквідаваны беларускія школы, распальваліся нацыянальная варожасць унутры краіны і нянавісць да народаў Совецкага Саюза. Жорстка падаўлялася ўсялякае праяўленне беларускай культуры, большасць насельніцтва была непісьменнай.

Непасільная праца і сістэматычнае недаяданне выклікалі ўсялякія захворванні і эпідэміі. У той-жа час медыцынская дапамога насельніцтву амаль адсутнічала. Дастаткова сказаць, што ў Маладзечанскім павеце на 90 тысяч чалавек насельніцтва была ўсяго адна бальніца на 30 ложкаў і тая знаходзілася ў антысанітарным стане.

Але шматпакутны і свабодалюбівы беларускі народ не стаў на калені перад яснавяльможнымі панамі. На працягу дваццаці год акупацыі заходніх абласцей Беларусі ён вёў самаадданую барацьбу за сваё вызваленне. У гэтай барацьбе яго натхняў прыклад працоўных вялікага Совецкага Саюза. Нягледзячы на тэрор і рэпрэсіі, ён ведаў, як жывуць яго адзінакроўныя браты ў Совецкай Беларусі. Ён змагаўся і верыў, што народы Совецкага Саюза не пакінуць яго ў бядзе і ў патрэбную мінуту акажуць неабходную дапамогу. Разам з тым, шлях да свайго нацыянальнага і соцыяльнага вызвалення ён бачыў у сумеснай барацьбе з польскім пралетарыятам супраць капіталістаў і памешчыкаў. Барацьбу беларускага народа ўзначальвала Комуністычная партыя Заходняй Беларусі, якая з'яўлялася састаўной часткай Комуністычнай партыі Польшчы.

Пачынаючы з 1919 года і да 1939 года па ўсёй Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне адбываліся стачкі, дэманстрацыі беспрацоўных, сялянскія выступленні, якія часта прымалі характар узброеных паўстанняў супраць капіталістаў і памешчыкаў і існуючага ладу. У гэтай барацьбе беларускі народ заўсёды салідарызаваўся з працоўнымі Польшчы. Калі ў 1932—1933 гадах баставалі беластоцкія тэкстыльшчыкі, то беларускія сяляне Гродзеншчыны, Слонімшчыны і іншых ак-

**У многіх калгасах пабудаваны прыгожыя тыпавыя памяшканні. На здымку: частка жывёлагадоўчага гарадка калгаса «За Радзіму» Глыбоцкага раёна.**



руг збіраліся і дастаўлялі ім харчы, а ў падтрымку беластоцкіх ткачоў аб'явілі стачку лясныя рабочыя, якая ахапіла ўсю Заходнюю Беларусь. У 1937 годзе ўспыхнулі забастоўкі сялян у Кракаўскім ваяводстве. Яны хутка распаўсюдзіліся на Заходнюю Украіну і Заходнюю Беларусь. І наадварот, калі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ўспыхвалі стачкі лясных рабочых, то іх актыўна падтрымліваў польскі пралетарыят.

Ні катаванні ў дэфензіве (ахранцы), ні турмы, ні канцлагеры, ні палявыя суды і шыбеніцы не змаглі зламаць гераічнай барацьбы беларускага народа за сваё вызваленне. За рэвалюцыйную барацьбу ў радах Комуністычнай партыі тысячы лепшых сыноў і дачок беларускага народа былі кінуты ў турмы і канцлагеры ў Картуз-Бярозе. Многія з іх аддалі сваё жыццё ў засценках ахранкі і турмах. Але на іх месца станавіліся новыя змагары за свабоду. Уладзімір Зянонавіч Царук, Павел Арсенавіч Жалезняковіч, Міхаіл Трафімавіч Анішчык і сотні другіх адданых барацьбітоў за справу комунізма правялі па 8—15 год у польскіх турмах, перанеслі зверскія катаванні. Але фашыстам не ўдалося зламаць іх непахісную волю да барацьбы за вызваленне свайго народа.

Якім быў цяжкім дваццацігадовы прыгнёт, такім быў радасным дзень вызвалення 17 верасня 1939 года. Хто быў відавочцам гэтых хвалюючых дзён, той іх ніколі не забудзе. Сваю вызваліцельніцу — Чырвоную Армію працоўныя Заходняй Беларусі сустракалі са слязьмі радасці на вачах, з пачуццём любві і адданасці Совецкаму Саюзу.

Народны (Нацыянальны ) Сход Заходняй Беларусі 28 — 30 кастрычніка 1939 года адзінадушна, пад воклічы «ура!» прыняў рашэнне аб устанаўленні Совецкай улады ў Заходняй Беларусі, аб далучэнні да Ўсходняй Беларусі і ўваходзе ў склад Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік, аб канфіскацыі памешчыцкай зямлі і нацыяналізацыі банкаў, фабрык і заводаў. Пасля дваццаці год няволі і пакут народ Заходняй Беларусі ўздыхнуў на поўныя грудзі, расправіў свае багатырскія плечы і з энтузіязмам узяўся за будаўніцтва шчаслівага і заможнага жыцця.

Але нядоўга працоўным гэтых абласцей давялося займацца мірнай стваральнай працай на абноўленай зямлі. На нашу Радзіму па-разбойніцку напалі ўзброеныя да зубоў полчышчы гітлераўскіх галаварэзаў. Яны хацелі цяжкім салдацкім ботам растаптаць адваяванае шчасце. Увесь совецкі народ грудзьмі стаў на абарону сваёй Айчыны. Працоўныя заходніх абласцей Беларусі, якія пазналі ўсю радасць свабоднай працы, таксама актыўна ўключыліся ў барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Дзесяткі тысяч совецкіх грамадзян з заходніх абласцей рэспублікі поплеч з народамі брацкіх рэспублік Совецкага Саюза змагаліся на франтах Айчыннай вайны, а тыя, што засталіся ў тылу ворага, па закліку Комуністычнай партыі і Совецкага ўрада сталі ствараць атрады народных мсціўцаў і патрыятычныя антыфашысцкія групы. Партызанскую барацьбу ўзначалілі комуністы, комсамольцы і другія патрыёты нашай Радзімы.

На тэрыторыі Маладзечанскай вобласці да пачатку 1942 года дзейнічала некалькі дзесяткаў буйных партызанскіх атрадаў, якія наносілі сакрушальныя ўдары па камунікацыях захопнікаў, знішчалі іх гарнізоны. Ні ўдзень, ні ўначы не давалі спакою гітлераўцам партызаны атрада «Спартак» пад камандаваннем тав. Крысава. Гэты атрад дыслакаваўся ў Каз'янскіх лясах Відзаўскага раёна. У Вілейскім раёне грамілі тылы ворага народныя мсціўцы атрада «За Совецкую Беларусь», якім камандаваў Герой Совецкага Саюза А. І. Валынец. Не адзін дзесятак вайсковых эшалонаў пусціла пад адкос праслаўленая група падрыўнікоў Героя Совецкага Саюза тав. Азончыка, што дзейнічала ў Маладзечанскім раёне.



**У горадзе Маладзечна пабудавана дзіцячая бальніца на сто ложкаў. У прасторным светлым памяшканні размясціліся тэрапеўтычнае і хірургічнае аддзяленні, кансультацыя. Тут добра абсталяваная аперацыйная, фізіятэрапеўтычны і рэнтгенаскапічны кабінеты, працэдурныя пакоі, летнія веранды. У бальніцы працуюць 30 урачоў, 50 медсясцёр і фельчараў. На здымку: новая дзіцячая бальніца.**



З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі